Ба 81150

В. Вальтар

Лясьнікова сена

Апавяданьне

З прадмовай К. Езавітава
і партрэтам аўтара

Рыга, 1932
Выданьне Беларускага Выдавецтва ў Латвіі

Бібліятэка

Прыймаецца падпіска на 1933 год

на адзіны ў Балтыцы беларускі штомесячнік

„БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА У ЛАТВІІ“

папулярна-навуковы, педагогіч. і літаратурна-грамадзкі часопіс

«Беларуская Школа у Латвіі» асьвятляе пераважна жыцьцё беларускіх школ і грамадзтва у Латвійскай Рэспубліцы, але апроч таго дае м й ца аглядам беларускага жыцьця у Літве, у Заходняй Беларусі (пад Польшчай), у Беларускай Радавай Сацыялістычнай Рэспубліцы ува Усходняй Беларусі (беларускія часткі Смаленшчыны, Пскоўшчыны і Брапшчыны), а таксама і жыцьцё беларусаў у іншых краёх.

«Беларуская Школа у Латвіі» працуе у цесным кантакце з Беларускім Навукова-Краязнаўчым Т-вам у Латвіі і зьмяшчае навукова-краязнаўчыя працы гэтага Т-ва ды публікуе матар'ялы з народнае беларускае творчасьці, сабраныя у Латгаліі і Ілукштаншчыне, сярод пражываючага тутака беларускага сялянства.

«Беларуская Школа у Латвіі» у наступным 1933 г. зьмесьціць шэраг стацей педагогічнага характару, як па пытаньням тэорэтычным, так і зьвязаным з штодзённаю практыкаю беларускіх школ. Зьвернута будзе увага і на тое, каб трымаць беларускае настаўніцтва у курсе працы „Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі“, а таксама і іншых вучыцельскіх аб'яднаньняў у Латвіі, у Літве, Эсьціі ды у іншых краінах.

Падпіска на **„Беларускую Школу у Латвіі“** выносіць:

за год, з перасылкаю, у Латвіі, Літве, Эсьціі	—	5 латаў,
за паўгода „ „	—	3.50.
за месяц „ „	—	0.50 сант.;
за год, з перасылкаю, у іншыя даяржавы	—	2 амер. даляры,
за паўгода „ „	—	1. — ам. даляр.

Тыя грамадзяне, што загадзя, да 20 сьнежаня 1932 году, перашлюць адразу усю падпісную плату за 1933 год. атрымаюць, як безграшовы дадатак, у прэмію гэткія кніжыцы: 1) К. Езавітаў — „Беларусы у Літве“, 2) К. Езавітаў — „Беларусы у мінулым і сучасным“ і А. Пажытнаў — „Нарысы тэорыі каапэрацыі“.

Грашовыя пераводы і карэспандэнцыю пакіроўваць трэба на адрас: Latvijā, Rīgā, Elija ielā, 20., dz. 25. „Bielaruskaja Škola u Latvii“

Redakcijai.

Матар'ялы, якія пакіроўваюцца для друку, павінны быць напісаны чытэльна ад рукі, або надрукаваны, пры магчымасьці, на пішучай машынцы. Пісаць і друкаваць **трэба толькі на адным** баку аркуша.

Беларускае Выдавецтва у Латвіі.

Ба 81150р

В. Вальтар

Лясьнікова сена

Апавяданьне

З прадмовай К. Езавітава
і партрэтам аўтара

Б 81/150

Бел. дзел
1994 г

Рыга, 1932
Выданьне Беларускага Выдавецтва ў Латвіі

25. 04. 2009

Друкарня Г. Іге, Рыга, Стары Горад, Vecpilsētā, 8. Тэлефон 34212.

Беларускі паэта «першакрокавец»

Віктар Бэнэдыктавіч Вальтар

* 15 (28). VII. 1902 — † 14. IV. 1931.



Віктар Бэнэдыктавіч Вальтар.

4-га красавіка 1931 году бязьлітасная сьмерць узяла ад нас яшчэ адну маладую літарацкую сілу. Страшэнная хвароба, гэтак пашыраная сярод недаядаючай беларускай моладзі, сухоты, дачасна зваліла ў магілу яшчэ аднаго паэту „першакрокаўца“ — у Дзьвінскай бальніцы Чырвонага Крыжа памёр Віктар Бэнэдыктавіч Вальтар.

З моманту выхаду ў пачатку 1926 году зборніка-альманаха „Першы крок“, што выданы быў гуртком 20 маладых беларускіх паэтаў у Латвіі, прайшло толькі шэсьць год, а мы ўжо страцілі чатырох удзельнікаў гэтага зборніку: Гэлену Іванову, памёршую 25 траўня 1926 году ад сухотаў, Валентыну Палубейка-Эпплe, скончыўшую сваё жыцьцё 27 лютага 1926 году ў трагічных абставінах разьбітага маладога каханьня, Якуба Воркуля, памёршага 20 чэрвеня 1931 году ад сухотаў у Рыскай бальніцы, і нарэшці Віктара Вальтара, памёршага ўсё ад тых-жа сухотаў.

Цяжкія эканамічныя ўмовы жыцьця нашага беззямельнага і малазямельнага сялянства, хранічнае безпрацоўʻе і недаяданьне нашых работніцкіх сямеяк па гарадох, робіць тое, што моладзь наша дачасна гіне на парозе жыцьця, часта-густа як раз у такі момант, калі вось-вось здаецца яна ўжо становіцца на свае ўласныя ногі і заваёўвае сабе мейсца ў грамадзтве. Над гэтымі афярамі нашае незаможнасьці і сацыяльнае прыгнечанасьці павінна моцна задумацца сьвядомейшая частка нашага грамадзтва і зрабіць усе высілкі, каб ратаваць тых, што яшчэ жывуць, але могуць зьгінуць у нас на вачох.

Віктар Бэнэдыктавіч Вальтар радзіўся ў горадзе Дзьвінску трыццаць год таму назад — 15 (28) ліпеня 1902 году. Бацька яго, па прафэсыі кравец, добра разумеў патрэбу вучэньня і, калі хлапцу споўнілася 9 год, аддаў яго спачатку ў 1-ю мястовую пачатковую школу, а па сканчэньні яе — у Дзьвінскае дзяржаўнае рэальнае вучылішча, дзе здольны хлапец выказваваў добрыя посьпехі. Усясьветная вайна выкінула сямейку Вальтараў, як і большасьць бе-

ларускіх сямёяк гораду Дзьвінску, у шэрагі ўцекачоў*). Пасьля доўгіх вандраваньняў сямейка асела на Украйне, у горадзе Харкаве, і тутака Віктар Вальтар пачаў адведваць Харкаўскае рэальнае вучылішча. У 1921 годзе Вальтары зьвярнуліся назад у Дзьвінск. Беларускае сярэдняе школы ў Дзьвінску пад той час яшчэ ня было, а таму В. Вальтар паступае ў 10-ю клясу (ці па сучаснаму ў апошнюю 4-ю клясу) Дзьвінскай мястовай расейскай сярэдняй школы, якую на круглых пяцёрках і сканчае ў чэрвені 1922 году. Адначасна, пачынаючы з студзеня 1922 году, ён адведвае Беларускія Дзяржаўныя Аднагадовыя Настаўніцкія Курсы ў Дзьвінску, якія і сканчае ў жніўню таго-ж 1922 году. У тую-ж восень 1922 году В. Вальтар трапляе ў лік беларускіх стыпэндзіятаў у Прагу, дзе паступае на землямерны факультэт Чэскага Вышэйшага Тэхнікуму. Цяжкі клімат Прагі, фабрычны дым, што вісіць над гэтым горадам, а таксама матар'яльныя недахопы, зрабілі сваю справу — праз тры гады малады студэнт, ня скончыўшы вучэньня, павінен быў зьвярнуцца на Бацькаўшчыну ў Дзьвінск і заняцца лячэньнем, бо набыў у Празе сухоты.

З 1926 году В. Вальтар працуе ў беларускіх школах Латвіі, спачатку ў Плейках Пустынскае воласьці, затым у Дзьвінску ў мястовай беларускай школе, потым у Рызе ў Дадатковай беларускай вячэрняй школе, якою кіруе некалькі месяцаў у 1930 годзе і, нарэшце, зноў выяжджае на вёску ў Келаўскую школу.

За час гэтае працы па школах хвароба рабіла сваю справу і ўсё больш разьвівалася. Цяжка было хвораму настаўніку працаваць у прымітыўных умовах беларускае вясковае школы, маленькае памешканьне, духата, вэнтыляваць памешканьне можна толькі праз адчыняньне дзьвярэй, а тады прастуджваюцца ногі, дык ня дзіва, што ўжо хутка мы бачым В. Вальтара ў вучыцельскай санаторыі ў Інчукалне. Троху падмацаваўшы сваё здароў'е, В. Вальтар перабіраецца на працу ў горад, але тут аказалася працаваць яшчэ цяжэй, асабліва адбілася на ягоным здароў'і праца ў 1930 годзе у Рыскай вячэрняй дадатковай школе, якая, можна сказаць, і зламіла яго канчаткова. Выезд на вёску ўжо не ўратаваў В. Вальтара, і праз некалькі месяцаў яго ня стала.

З творчасьцьцю В. Вальтара беларускае грамадзтва знаёма мала, бо спыненьне Рыскай беларускай газэты „Голас Беларуса", у якой ён начаў друкавацца з 1925 году, не давала яму магчымасьці выпускаць свае творы ў Латвіі, а Заходня-беларускія выдавецтвы заваленыя працамі сваіх пісьменьнікаў і дужа абмяжованыя ў сваіх грашовых магчымасьцях, не маглі зьвярнуць належнае ўвагі на маладога беларускага пісьменьніка з Латвіі. Таму большасьць ягоных твораў асталіся ненадрукаванымі аж да гэтага часу.

*) У Дзьвінску перад вайной было 110.000 жыхароў, а пасьля вайны у 1919-20 годзе ледзь-ледзь налічвалася 30.000 чалавек. Такім чынам 80.000 чалавек, або 72% усяго жыхарства гораду, апынуліся на чужыне, у якасьці уцекачоў, самахоць ці пад прымусам расейскае улады высяленых з Дзьвінску.

Пісаў В. Вальтар вершы, апавяданьні і нават пакінуў нідзе яшчэ не друкаваны вялікі раман — „Роджаныя пад Сатурнам“, у якім апісвае жыцьцё беларускае эміграцыі і студэнцтва ў Празе. Творы ягоныя зьяўляліся ня толькі пад ягоным уласным прозьвішчам, але і пад псэўданімам „Янка Палын“.

Ня гледзячы на хворасьць, не ўхіляўся В. Вальтар і ад грамадзкае працы, прыймаючы чынны ўдзел у шэрагу беларускіх культурна-асьветных і грамадзкіх арганізацый, а таксама бяручы удзел у працы беларускіх газэт: „Голас Беларуса“ (у Рызе) і „Наша Доля“ (у Дзьвінску).

Наскольки аддана ставіўся В. Вальтар да сваей працы, як вучыцель, найлепш сьведчаць яго апошнія дні, аб якіх нам піша вучыцель А. Барткевіч з Дзьвінску наступнае:

„У 1931 годзе 20 сакавіка ён (В. Вальтар) захварэў на запаленьне нырак. Ня гледзячы на цяжкую хваробу, ён ня кідаў працы ў школе. У працягу трох дзён ён ня мог зьняць боты, бо распухлі ногі, аднак у школу хадзіць ён ня кінуў, і толькі 2-га красавіка адважыўся ён выехаць са школы ў Дзьвінск, дзе зараз-жа адвязьлі яго ў бальніцу Чырвонага Крыжа“.

Якога моцнага духу і характару быў В. Вальтар, як чалавек, і наколькі адважна і спакойна глядзеў ён у вочы набліжаўшайся сьмерці, сьведчыць нам другі яго калега з Дзьвіншчыны — вучыцель А. Махноўскі. А. Махноўскі спаткаў з красавіка В. Вальтара, калі апошняга вязьлі ў бальніцу.

„Падышоўшы да В. Вальтара, я прывітаўся, — апавядае А. Махноўскі, — і запытаў:

— Як адчуваеш сябе, братка?

— А Віктар мне і адказвае: „Ты гутарыш ужо ня з Вальтарам, а — з трупам!“

На другі дзень, 4 красавіка 1931 году В. Вальтар ужо памёр. 7 красавіка беларускае грамадзтва прадстаўнікі беларускага вучыцельства, з вянкамі і прамовамі, правадзілі свайго маладога паэту на каталіцкія могілкі ў Дзьвінску.

Тут трэба адзначыць характэрную дэталь, аб якой паведамляе гр. А. Барткевіч: „Рэлігійныя бацькі нябошчыка В. Вальтара зажадалі, каб на могілкі труну з іх сынам праводзіў каталіцкі ксёндз. Аднак, ніводзін ксёндз з Дзьвінску, як іх бацькі не запрашалі, ня згодзіўся прыняць удзелу ў пахаваньні, спасылаючыся на тое, што нябошчык ня быў рэлігійным і не хадзіў да споведзі“.

Беларускае Выдавецтва ў Латвіі, выпускаючы гэтую караценькую біографію Віктара Вальтара і адно з ягоных апавяданьняў, напісаных за час побыту ў санаторыі, — ставіць сабе мэтай паінфармаваць беларускае грамадзтва аб спадчыне па нябошчыку, узьняць цікавасьць да ягонае творчасьці і пракласьці дарогу да выхаду ў сьвет іншых твораў, а ў першую чаргу вышэйўспамінанага яго раману „ Роджаныя пад Сатурнам“.

Усіх грамадзян, у каго захаваліся лісты, фатаграфіі, або творы гр. В. Вальтара, Беларускае Выдавецтва просіць надаслаць іх на адрас Выдавецтва, або ў Рэдакцыю штомесячніка „Беларуская Школа ў Латвіі“ (Latvijā, Rīgā, Elija ielā 20, dz. 25). Усё надасланае будзе з уздзячнасьцьцю выкарыстоўвацца пры наступных выданьнях твораў нябошчыка. Дужа патрэбны Выдавецтву і весткі аб тых творах В. Вальтара, якія ўжо трапілі ў свой час у беларускім, або чэскі друк.

К. Езавітаў.

Рыга, 5 лістападу 1932 году.

Лясьнікова сена

Цяпер я не магу ўспамінаць гэтага бяз сьмеху, але тады — мне было зусім ня сьмешна.

Я толькі што перайшоў літоўскую граніцу. Памятаю, што бабуля, якая мяне праводзіла акопамі, праз самыя страшныя мейсцы, і якая мне дала на дарогу добрую порцыю хлеба з маслам, — пры расставаньні сказала:

„Ну, далей, я не пайду! — Тут ужо латышы. Яны могуць мяне злавіць. Ідзі — вось гэтай дарогай, проста, нікуды не зварачываючы".

Яна паказала пры гэтым рукой па роўнай дарозе, выхадзіўшай з лесу ў адкрытае поле.

„Так гэта ўжо Латвія?" — спытаў я ў надзвычайным зьдзіўленьні.

Мне малявалісь надзвычайныя эпізоды — пагоня, пабег, стрэлы... І раптам, зусім проста, — быццам з мяжы аднаго поля, пераходзячы на мяжу другога, — я перайшоў граніцу. Мне хацелася расцалаваць ад радасьці бабулю, але пакуль я агледзіўся, яна была ўжо далёка ад мяне. Толькі вецер разьвіваў канцы яе хусткі ды, фалды спадніцы, нагадываючы нейкую гэроіню рамантычнай фільмы.

Я спакойна адпачнуў і пашоў. Праз які час зблудзіў, ледзь не наткнуўся на прахадзіўшага полем, з патупленай у зямлю галавой, літоўскага пагранічніка, але нейкім цудам захаваўся за сасну і застаўся незаўважаным. Потым чуў у лесе нейкія выстралы, — ня то паляваньня, ня то пагранічнай варты, — уцякаў. І вось, нарэшці, выйшаў на вялічэзны гасьцінец, што вядзе ў мой родны Дзьвінск.

Я свабодна ўздыхнуў. Так вось яна, мая Бацькаўшчына, дзе калісьці ўсё пенілася, іскрылася ўсімі фарбамі вясёлкі, дзе прайшло (балей чым мінуўшы—забыты час!) маё мілае, сьветлае plusquamperfectum. І ўсё-ж-ткі, цяпер Бацькаўшчына ня тая, і я ня той: няма пражытых гадоў, зламаных і зьнішчаных сіл.

Пакуль я так, поўны лірыкі, сядзеў на беразе дарогі, зьвесіўшы ногі ў канаву, калі гляну — што за ліха! — ляціць проста на мяне з усей сілы падвода. На падводзе відаць некалькі чалавек, ня інакш як мяне забіраць. „Што-ж?" — думаю: — „Уцякаць няма куды. Пайду сьмела наперад!" А ў галаве ўжо заскакалі магчымыя тлумачэньні, чаму я апынуўся ў гэтай пагранічнай паласе.

Пад'яжджае падвода бліжэй, яшчэ бліжэй. У мяне сэрца замёрла, — нават чую, што ня б'ецца. Вось ужо ногі не магу падняць, язык адымае, горла сохне. „Ну, думаю, вось і перайшоў граніцу"!

Раптам, падвода раўняецца са мной, і барадаты старавер, кіруючы канём, крычыць:

„А, маладзец, чакай мяне на адваротным шляху!"

І падвода пакаціла далей. Я нават людзей не пасыпеў разглядзець.

Іду далей, лаю сябе за трусасьць, плююся на ўсе бакі дарогі ды лаю ня ў час вясёла праглянуўшае сонца. Ісьці стала зусім немагчыма, ня тое што зраньня, калі дождж ліў, як з вядра, і ўсе пагранічнікі пахаваліся.

Іду. Да Дзьвінску яшчэ далёка. Каб было весялей, лічу белыя камені, пастаўленыя па бакох гасьцінца. Раптам чую, нехта едзе за мной. Аглядаюся — тая самая падвода, якую я спаткаў раней. Едзе адзін.

„Ну, паедзем?" — пытае мяне той самы барадаты старавер.

„Паедзем, калі падвязеш!" — адказваю я.

„Ну, так колькі дасі?" — пытае ён зноў мяне.

Пачалі таргавацца. Я толькі тое і казаў, што хвост яго каню не адваліцца, калі ён мяне падвязе, бо ўсё-ж роўна ён едзе парожняком. Ен, нарэшці, сьцябануў па каню й паехаў.

Усе магчымыя й немагчымыя пракляцьці сыпаў я на яго галаву, бо адчуваў, што ў меня ўжо пяткі баляць і мускулы на нагах нацягнуліся да таго, што я хутка зусім не змагу йсьці. Ну, усё раўно... Іду, поўны гневу на род людзкі, і філёзофскі разважаю, што „челавек — самая жорсткая жывёла". Ніколі ён лепш сябе не адчувае, як у часы інквізыцый, жорсткіх войн, жахлівага тэррору. Іду, а ў душы ўстае нота з „Дэмана:" — „Праклятый сьвет, ганебны сьвет!"

Раптам — гляжу й ня веру. — Старавер спыніў каня й чакае. Я йду міма, пэўны, што не мяне.

„Ну, сядай ужо! Так і быць—падвязу!"—кажа ён зненацку.

Я быў проста зьбіты гэтым. „Ну", думаю: „усё-ж-ткі чалавек не такі дрэнны. Відаць — добрае сэрца. Не, сьвет зусім не такі дрэнны!"

Едзем. Я пытаю, каго ён адвазіў. Ен кажа, што жыдкоў на кірмаш у Літву. Яны едуць туды кождую нядзелю. Пад'жджаем далей. Насустрэч нам паўзе воз з сенам. Вялізарны воз, а наперадзі вядзе каня нейкі худы, высокі чалавек у форме лясьніка. Баба сядзіць на вазу й трымае лейцы. Мы хутка праехалі міма яго і праз нейкі час аказаліся ўжо ў значнай ад яго адлегласьці. Гляджу, мой фурман спыняецца, выскаківае з возу й давай накладываць сена, толькі што пакошанае й ляжачае на краю дарогі для прасушкі, — у свой воз.

Убачыўшы, што мой прыяцель працуе,—я адчуваю, што мне нязручна сядзець у гэты час на калёсах. Я саскакваю і, поўны

ўздзячнасьці да гэтага добрага чалавека, падвёзшага мяне, стараюся пакласьці паболей ахапак сена на воз ды мяркую, каб кождая ахапка была як мага больш.

„Годзі!“ — кажа фурман.

У гэты час аглядаецца далёка ўжо ад нас ад'ехаўшы, лясьнік: „Дзяржы іх!“—крычыць ён: — „Дзяржы!“ І сам ляціць да нас.

Мой фурман сядае на каня і ўва ўвесь дух ляціць па гасьцінцу. Ясна, што лясьніку нас не дагнаць. Наперадзі ня відаць ні жывой душы. Мне робіцца сьмешна. Я сабе думаю: — „Ня зловіш!— Насып каню солі на хвост!“

Тым часам на небасхіле паказываюцца дзьве мускія постаці, нешта нясучыя ў рукох. Лясьнік ува ўсё горла крычыць: „Дзяржы іх! — Дзяржы іх!“

„Здаровыя лёгкія“ — думаю — „у гэтага лясьніка! — Крычыць — аж за тры вярсты чуваць!“ І зноў мне робіцца сьмешна. Я пэўны, што тыя мужчыны, якія йдуць нам насустрэч, нас чапаць ня будуць. Якая ім справа да нас!

Між тым, дзьве постаці ўжо набліжаюцца. Я бачу, што абедзьве яны абцепленыя фарбамі ды вапнай, з вёдрамі і пэндзэлямі ў рукох, — пэўна маляры. Лясьнік ужо не ляціць, а йдзе звычайным крокам. І вось разам:

„Стой!“ — Маляры схапілі каня за морду й ня пушчаюць.

Мне здавалася, што мой фурман зробіць нешта энэргійнае, а потым — па каню! — і толькі нас бачылі. А ён сядзіць спакойна і чакае, пакуль падляціць лясьнік.

„Ну, дзеля якога ражна вы затрымалі нас!“ — кажу я. — „Якая карысьць вам ад гэтага?“

„А мы працуем у гэтага лясьніка. Ня можам!“ адказываюць яны.

Зьдзіўлены, зьнішчаны ўсей выпадковасьцяй трапіўшагася — я таксама сяджу на крадзеным сене й чакаю лясьніка.

„А, вам сена красьці! — Казённае сена, злодзеі!“ — зарычаў на нас лясьнік. — „Сядайце, хлопцы, — павязём іх да дарожнага майстры“.

Муляры з лясьніком ускочылі ў калёсы, пацісьнулі мяне як трэба быць, і мы ўсе пяцёра паехалі на суд гэтага вялікага чалавека, дарожнага майстры!

Я ўсю дарогу маўчаў. Толькі мне было неяк дзіўна, што лясьнік усё нешта шаптаўся з стараверам і потым усё скоса паглядаваў на мяне.

Пад'ехалі да мураванага доміку. Навокал — сад, далей відаць засеянае поле, наагул чалавек жыве панам. Лясьнік выскаківае і падымаецца па дарожцы. Насустрэч яму выходзе здаровы, тоўсты, сярэдняга росту мужчына, з тыпічным тварам дзясятніка, а за ім выскаківае ўся яго дзетвара і, пераваліваючыся з аднага тоўстага боку на другі, як качка, выплывае жонка.

Лясьнік зрабіў начальству нейкі даклад.

„А! — так вы так! — Знача, казёнае сена красьці!? Ды вы ведаеце, што вам за гэта будзе?“

„Пан майстар!“ — кажа старавер, паказываючы на мяне: — „Гэта ня я, гэта — ён!“

„А! — так гэта ты, злодзей! Сёньня сена ўкраў, а заўтра каня ў мяне ўкрадзеш!“

Мяне забрала злосьць. Я ня мог выцярпець асабліва таго, што фурман мог сказаць такую брахню. Фактычна навошта мне сена, калі ў мяне ні каня няма, нічога. Калі-б мяне мой фурман папярэдзіў, што гэта сена казённае, ды калі-б ён сам ня браў яго, дык я ніколі-б і не падумаў аб гэтым сене. Заместа таго, каб адразу апраўдывацца, я проста пачаў грубіяніць майстру.

„Прашу не крычэць!“ — сказаў я: — „Я не такіх бачыў, як вы, ды й то!...“

„А, то ты так!—Камуніст, сукін сын!“—крыкнуў ён на мяне.

Мяне быццам выцялі кнутом па твары. Так вось куды справа зайшла з-за простае ахапкі сена! Я зразумеў у адну мінуту сваё становішча. Усе прысутныя былі проціў мяне.

Фурман, я цяпер толькі дагадаўся, шопатамі нагаварываў лясьніку аб тым, што бачыў мяне каля мяжы і што я, пэўна-ж, камуністы. Ен выгарадзіў гэтым сябе са справы з сенам. Уся сіла абвінавачаньня падала на мяне. А дакумэнтаў у мяне ня было ніякіх, апрача некалькіх літоўскіх пасьведчаньняў. Чым я мог давесьці гэтым людзям, што я не камуністы.

І наколькі я раней сьмяяўся з усяго гэтага, як з вясёлага здарэньня пасьля пераходу граніцы, настолькі я цяпер зразумеў усю сур'ёзнасьць свайго становішча. Сэрца маё ўпала. „Вось і перайшоў граніцу!“ — мільганула іскрай ў маім мазгу. А воддаль так прывабна, так прыгожа паднімаліся будынкі і блішчэлі царквы даўно чаканага Дзьвінску.

Я замаўчаў. Я кінуў некалькі поглядаў на жонку майстра і на яго дзяцей і мне чамусьці падумалася: „Вось жа, які зусім мірны здаецца, чалавек, і жонка, і дзеці, а не — глядзі! — так і хоча другога ўтапіць“. Зноў успаміналася лацінская пагаворка: „Чалавек чалавеку — воўк ёсьць“.

Лясьнікова-ж жонка стаяла нахмурыўшы чало і здаецца гатова была мяне пабіць.

„Адвясьці яго ў паліцыю!“ — загадаў майстра.

„Трэба яго зьвязаць, а то ўцячэ, сукін сын!“ — сказаў мой фурман. Ен цяпер стараўся быць паслушным і, ад радасьці, што запамяталі пра яго злачынства, стараўся нават папярэдзіць усіх. Ен парыўся ў сваіх калёсах, але, на маё шчасьце, вяроўкі не знайшоў.

Ня ведаю, ці майстра не хацеў ісьці сам да хаты, ці спадзяваўся, што я і так не ўцяку, толькі ён загадаў: „Ды вязеце так! Годзе вам вазіцца з ім. Хутчэй, а то ўжо вечар!“

Худы лясьнік і барадаты старавер селі ў калёсы, пасадзіўшы мяне паміж сябе, і мы ўва ўвесь пыл паляцелі па гасьцінцу. Май-

стра і муляры доўга глядзелі нам усьлед, пакуль мы ня зьніклі з іх вачэй.

І вось, мы на Грыве. Шырокая Дзьвіна вабіць мяне, — хутка мы пад'едзем да перавозу. Я ведаю гэта мейсца. Вось бы лодка! — Тады Дзьвіна — найлепшы абаронца. Лясьнік і фурман закурылі. Фурман усю дарогу маўчаў, і толькі збоку я бачыў, як ён усьмяхаўся ў сваю бараду Лясьнік перагнуўся зусім праз калёсы да фурмана дастаць вагню.

У гэты момант я скочыў з калёс. Мінута — і я быў бы вольны. Але барадаты фурман неяк спрытна пасьпеў схапіць мяне за руку, лясьнік апамятаўся і зноў уваліў мяне ў калёсы.

І так я, усё-ж-ткі, з-за сена апынуўся ў паліцыі.

Зьнялі дапрос. Пасадзілі ў студзёную. І доўга яшчэ прымусілі пакутаваць мяне за пераход граніцы. А ўсяму віной была толькі маленькая ахапка сена.

Ну, што вы цяпер на гэта скажаце?

В. Вальтар.

Інчукалн, Санаторыя,
1928 год.

Б 8°1150

Беларускае Выдавецтва ў Латвіі

Rigā, Elija ielā, 20, dz. 25, тэлефон 2-9-9-2-2

выпусьціла гэткія кніжкі:

1. Ф. Аляхновіч — „У лясным гушчары". Казка ў 1 акце для дзяцей малодшага веку.
2. В. Вальтар — Лясьнікова сена. Апавяданьне. З прадмовай К. Езавітава і партрэтам аўтара.
3. К. Езавітаў — „Беларуская Школа". Першая чытанка пасьля лемантара.
4. К. Езавітаў — „Беларусы ў мінулым і сучасным". Кароткі канспэкт для лекцый з чароўным ліхтаром.
5. К. Езавітаў — „Беларусы ў Літве". Нарыс прысьвечаны беларускай меньшасьці ў Літве.
6. К. Езавітаў—Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва „Бацькаўшчына" у Латгаліі.
7. Mat. Jezovitova — „Vecā baltkrievu kultura un literatura".
8. Mat. Jezovitova — „Iss jaunas baltkrievu literaturas pārskats".
9. Яээп Лёсік — „Наша Крыніца". Чытаньне для вучняў III і IV кл. ас. шк.
10. А. Луцкевіч — „Як вучыць у новай школе". Мэтодычны нарыс.
11. К. Пажытнаў — „Папулярныя нарысы тэорыі каапэрацыі".
12. Пятро Сакол. — „На сьвітаньні" Зборнік вершаў.
13. Статут „Т-ва беларускіх вучыцялёў у Латвіі". З прадмовай К. Езавітава.
14. Статут Беларускага Навукова-Краязнаўчага Т-ва ў Латвіі.
15. Паштоўка — „Працэнт беларускае нацыянальнае меньшасьці ў Латгаліі і Ілукштанішчыне, згодна 1-га Уселатвійскага перапісу 14 чэрвеня 1920 году.

Знаходзяцца ў друку гэткія кніжкі:

16. К. Езавітаў — „Беларусы ў Латвіі". Статыстычна-гістарычны нарыс з жыцьця беларускае меньшасьці ў Латвіі.
17. С. Казэка — Люцынская беларуская аснаўная 6-ціклясовая школа за дзесяць год працы. 1922—1932.
18. Паштоўкі з партрэтамі: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кастуся Каліноўскага, Яўхіма Карскага ды іншых беларускіх паэтаў, вучоных і грамадзкіх дзеячоў.

Зьмест кніжыцы:

Беларускі паэта „першакрокавец" В. Вальтар. Партрэт . . . . . 3 балонка.
К. Езавітаў — Віктар Бэнэдыктавіч Вальтар. Біографічны нарыс . . 5 „
В. Вальтар — Лясьнікова сена. Апавяданьне . . . . . 9 „
Абвесткі Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. . . . . 16 „

Беларускае Навукова-Краязнаўчае Таварыства ў Латвіі

рыхтуе да выпуску зборнік пад назовам:

Біографіі дзеячоу Беларускага Адраджэньня

У зьвязку з гэтым Праўленьне Т-ва зьвяртаецца да усіх беларускіх паэтаў, грамадзкіх дзеячоў, вучыцялёў, артыстаў і усіх іншых грамадзян, актыўна працаваўшых і працуючых у беларускім адраджэнчым руху, з просьбаю як мага хутчэй надаслаць у канцалярыю Т-ва: 1) падрабязныя с в а е аўтабіографіі і фатаграфічныя карткі; 2) біографіі і фатаграфіі тых беларускіх дзеячоў, што самі, па тых ці іншых прычынах, прыслаць аб сабе вестак ня маюць магчымасьці.

Усе матар'ялы трэба накіроўваць на адрас: Latvijā, Rigā, Elija ielā, 20, dz. 25. K. Jezavitavu.

Праўленьне Таварыства.

Выпісвайце зборнік вершаў маладога беларускага паэты у Латвіі Петры Сакала —

«НА СЬВІТАНЬНІ»

Зьмест зборніку гэткі: 1. Прадмова — К. Езавітава. 2. Разьдзел — „На сьвітаньні", з 6 вершамі. 3. Разьдзел „Дурман каханьня", з 14 верш. 4. Разьдзел — „Песьні аб волі", з 20 вершамі на грамадзкія тэмы (найбольш цікавы разьдзел у зборніку). 5. Разьдзел — „Пераклады", з 3 вершамі.

Кошт зборніку — 1 лат з перасылкай да хаты. Грошы можна перасылаць паштовымі ці гэрбавымі 10-сантымавымі маркамі.

Выпісваць зборнік і маркі надсылаць па адрасу:
Baltkrievu Izdevniecība Latvijā, Rigā, Elija ielā № 20, dz. 25.

Беларускае Выдавецтва у Латвіі прапнуе

Беларускія адрыўныя календары на 1933 г.

Кошт пасобнага календара — 80 сантымаў, а з перасылкай да хаты — 90 сант. Грошы можна перасылаць пераводам, або паштовымі маркамі па адрасу: Rigā, Elija ielā 20, dz. 25. Baltkrievu Izdevniecība.

Купляйце, выпісывайце і пашырайце часопісь беларускай моладзі

«ШЛЯХ МОЛАДЗІ»

(Вільня, Завальная вуліца 6, кв. 10),

якая выходзіць што месяц ад 1929 году рэдагаваная Рэдакцыйнай Калегіяй. У часопісі „Шлях Моладзі" зьмяшчаюцца стацьці у духу выхаваўча-грамадзкім, народным, апісваецца жыцьцё беларускага народу, вядзецца багаты аддзел літаратуры, гісторыі, навукі, цікавай усячыны, хронікі і інш. Падпіска на „Шлях Моладзі" за год каштуе: у Латвіі 3 латы, а у Літве — 6 літаў. З Латвіі і Літвы падпіску на „ШЛЯХ МОЛАДЗІ" прымае экспэдыцыя штомесячніка „Беларуская Школа у Латвіі"

Latvijā, Rigā, Elija ielā, 20, dz. 25. Redakcija „Belaruskaja Škola u Latvii".

-10

800000003107457

Кошт 50 сант.

1964 г.

Бел. гідзея
1994 г.